*Хто выратаваў аднаго чалавека — той выратаваў Свет* (З Біблії)



# СВЯТЫЯ ЛЮДЗІ

Гэта не журналісцкае перабольшанне. Так назваў жыхароў р.п.Мікашэвічы Веру Ігнатаўну Цубу і Паўла Паўлавіча Вялічку Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Дзяржавы Ізраіль у Беларусі Эліяху Валк, уручаючы ім дыпломы Праведнікаў Народаў Свету. Улічваючы, што мала хто ведае пра гэта званне, крыху ўдакладнім.

*У Іерусаліме працуе інстытут Катастрофы і Гераізму Яд-ва-Шэм, у якім вядзецца вялікая работа па збору і вывучэнню матэрыялаў другой сусветнай вайны. Зразумела, гэтыя даследаванні датычаць перш за ўсё* ...

ул. Фабрычная 26, кв. 2

ул. Новая 32 тел. 29-310

Да вайны сям'я Хайі Рабіновіч і сям'я Марыі Корбут жылі ў адной вёсцы Рахавічы. У пачатку акупацыі немцы сагналі ўсіх яўрэяў у гета ў раённы цэнтр Леніна. Але партызаны разбілі фашысцкі гарнізон, у выніку чаго яўрэі разбегліся, хто куды мог.

Сям'ю Рабіновічаў схавала ў сябе Марыя Корбут. Яна і дзеці пільна сачылі, каб пра гэта не даведаліся ні немцы, ні суседзі. Давялося ўцекачам шукаць схованішча то ў хляве ... сабе. Вось усе і маўчалі.

Але Рабіновічы не забыліся пра сваіх выратавальнікаў. І пасля прызнання незалежнасці Рэспублікі Беларусь яны звярнуліся ў Яд-ва-Шэм з просьбай аддзякаваць Марыі Корбут і яе дзецям. Некалькі гадоў працягвалася праверка ўсіх матэрыялаў (а прысваенне робіцца на падставе строга дакументальнай, рашэнне прымаецца спецыяльнай камісіяй) — і, нарэшце, падзея адбылася.

Сапраўды, гэта была падзея. У Ізраільскім інфармацыйна-культурным цэнтры ў сталіцы Беларусі 24 кастрычніка сабралася многа людзей. Для былых вязняў гета гэта быў дзень памяці знішчэння мінскіх яўрэяў, для грамадзян Ізраіля — гадавіна жалобы па забітаму Прэм'ер-Міністру Іцхаку Рабіну. Сярод прысутных таксама яўрэі са сваімі выратавальнікамі, таму што галоўнай урачыстасцю вечара стала цырымонія ўручэння Дыпломаў Праведнікаў Народаў Свету.

Вытрымкі з гісторый выратавання яўрэяў зачытвала Авіва Валк — памочнік Консула і жонка Пасла Дзяржавы Ізраіль. Яна асабіста займалася падрыхтоўчай работай, дасканальна вывучала дакументы, знаёмілася з людзьмі. Час ад часу ў яе перарываўся голас, а вочы прысутных напаўняліся слязьмі — выпадкі выратавання здаваліся цудам. І менавіта гэтай кволай маленькай жанчыне дзякавалі выратаваныя за аднаўленне справядлівасці ў адносінах да выратавальнікаў. За 3 гады работы Пасольства Дзяржавы Ізраіль і Авівы Валк уручана 75 з 95-ці Дыпломаў на Беларусі.

Пасведчанне аб ганаровым званні ўручаў Пасол Эліяху Валк. Ён выказаў шчырае шкадаванне, што пакуль медалі знойдуць Праведнікаў, многія з іх пойдуць з жыцця, многім з іх не паспеюць падзякаваць, заклікаў да актывізацыі пошуку людзей, якія ратавалі яўрэяў.

Для кожнага Пасол знайшоў непаўторныя словы віншавання (а ўручаліся 8 медалёў і каля двух дзесяткаў Дыпломаў). Узнагароджваючы Паўла Паўлавіча Вялічку, у якога на грудзях ззяў ордэн Вялікай Айчыннай, Эліяху Валк пажадаў, каб такія подзвігі не паўтараліся, каб народы свету жылі ў згодзе і дружбе, каб не было войнаў. А 80-гадовая Вера Ігнатаўна Цуба ў звычайнай вясковай вопратцы, з сагнутымі ад цяжкасцей жыцця плячыма, але з прывабным тварам і ласкавым позіркам, зрабіла такое ўражанне на Пасла, што ён назваў яе сімвалам Беларусі за спалучэнне знешняй прыгажосці і ўнутранай дабрыні. І захацеў сфатаграфавацца менавіта з мікашэвіцкімі Праведнікамі. Цяпер яны чакаюць канверт з фотаздымкамі з Ізраіля.

Т.КАНАПАЦКАЯ.

*ванні датычаць перш за ўсё яўрэйскага народа — знішчэння 6 мільёнаў яўрэяў фашыстамі і супраціўлення вязняў гета нямецкім акупантам. Але вялікай часткай гэтай работы, часткай мемарыяльнага комплексу Яд-ва-Шэм, стала ўвекавечанне імёнаў людзей розных нацыянальнасцей, якія ўдзельнічалі ў выратаванні яўрэяў. Гэтыя імёны выбіты на мармуровых дошках, у гонар кожнага высаджана дрэва на алеі Праведнікаў Народаў Свету. Цяпер да больш чым 12 тысяч імёнаў дабавяцца яшчэ тры — нашых землякоў.*

Не памылілася. Званне Праведніка Народаў Свету яшчэ прысвоена пасмяротна Марыі Корбут — маці Веры і Паўла. Аб гэтым нагадвае медаль, на якім выбіта імя яе дзяцей, В.І.Цуба і П.П.Вялічку ўручаны і адпаведныя дыпломы. У гэтых прыгожых папках змешчаны тэкст на іўрыт і на англійскай мовах, дзе распавядаецца пра высакародны ўчынак звычайнай палескай сям'і. Дадаткова ўкладзены аркуш паперы з рускім перакладам, з якога вынікае наступнае.

ні суседзі. Даводзілася ўцекачам шукаць сховішча то ў хляве, то ў лесе. Але 2 гады гэтыя беларусы і яўрэі жылі адной сям'ёй, харчаваліся разам з аднаго катла. Потым дзеці Корбут, якія былі звязаны з партызанамі, дапамаглі малодшым Любе і Міхаілу Рабіновічам таксама пайсці ў атрад, а іх маці працягвала жыць у Марыі. І пасля вайны сем'і падтрымлівалі сяброўскія адносіны.

Аб далейшым мне расказвалі дзеці Марыі Корбут. У 1944-м Паўла Паўлавіча мабілізавалі ў Чырвоную Армію, з баямі дайшоў да Берліна, мае ўзнагароды. Вера Ігнатаўна з жахам прыгадвае пасляваенныя беды, калі бульбаўцы спалілі іх хутар. Сям'я вырашыла перасяліцца на новае месца — у Мікашэвічы. Месцам работы для сястры стаў лесазавод, для брата — спачатку лясніцтва, потым — леспрамгас.

Тым часам Рабіновічы сталі жыць больш заможна, іншы раз матэрыяльна дапамагалі сябрам. Потым яны выехалі ў Ізраіль, а гаварыць пра ўсё, што звязана з эмігрантамі, было не на карысць




*ПАСТСКРЫПТУМ. Не магла не зацікавіцца, чаму ў брата і сястры розныя імёны па бацьку і прозвішчы. Высветлілася, што першынца Марыі ўдачарыў дзядзька, які не меў дзяцей, каб пакінуць ёй сваю спадчыну. Другі — сын Павел носіць прозвішча бацькі, які памёр у 20-х гадах. Марыя выйшла замуж за Рыгора Корбута, які таксама памёр да вайны. Было яшчэ трое: Люба, 1926 г.н., жыве цяпер у Крыму, а Іван, 1928 г.н., і Уладзімір, 1934 г.н., — жыхары Мікашэвіч. Так што Праведнікамі можна лічыць і Марыю, і пяцярых яе дзяцей. Рабіновічы назвалі толькі старэйшых. У час удакладнення абставін можна было б прыгадаць усіх. Але мала хто верыў, што нешта з гэтых перапісак атрымаецца.*

*Атрымалася. Верыцца і ў тое, што хутка па прыкладу Літвы і Украіны і наша рэспубліка прыме рашэнне аб прысваенні Праведнікам Народаў Свету — грамадзянам нашай дзяржавы — звання Праведнікаў Беларусі.*

*Т.К.*

*Фота Р.ЖУКА.*

